6. Гриневич, В. Расколотая память. Вторая мировая война в историческом сознании укаинского общества / В. Гриневич // Неприкосновенный запас. – № 2 – 3. 2005. – С. 218 – 227.
7. Шеррер, Ю. Германия и Франция: проработка прошлого / Ю. Шеррер // Pro Et Contra. – 2009. – Май – август. – С. 98 – 108.
8. Ластовский, А. Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой / А. Ластовский // Полит.ру [Электронный ресурс]. – Дата доступа: 15.04.2015. – Режим доступа: http://polit.ru/article/2010/07/19/belorus/

УДК 94(476)

С. Г. Смаляк

## НЯМА ГЕРОІКІ ВЫШЭЙ, ЧЫМ ГЕРОІКА НАРОДА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА СВАЮ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І СВАБОДУ

Прайшло 70 год з дня Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг. Перамогі, за якую ён заплаціў вялікую цану. 70 год наш народ жыве пад мірным небам і ўпэўненым крокам ідзе ў будучыню. У чым жа прычына гэтай Перамогі? Што з'явілася падставай разгрому агрэсара? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні з'яўляюцца сутнасцю нашага артыкула, пачаць які лічым з канстатацыі таго факта, што савецкі народ перамог у вайне, якая была распачатая вераломным, але загадзя спланаваным нападам нацысцкай нямеччыны на Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 г. [1, с. 76]. Пры гэтым першапачатковай мэтай агрэсіі было не проста заваёва геаграфічнай прасторы, а заняволенне і фізічнае знішчэнне насельніцтва краіны, на якую была здзейснена агрэсія. У прыватнасці, распрацаваным нацысцкімі бонзамі планам «Ост» прадугледжвалася ліквідацыя цэлых расавых адзінак, высяленне у Сібір  каля 31 млн. чал. з тэрыторыі Польшчы і Заходняй часткі СССР, у тым ліку 75 % насельніцтва Беларусі [4, с. 155, 152]. Такім чынам, можна канстатаваць, што ўпершыню ў гісторыі вайна ў аснове сваёй грунтавалася на палітыцы шавінізму, сродкамі правядзення якой быў абраны генацыд народаў.

Кожная дзяржава, калі над ёй навісае смяротная пагроза агрэсара, абараняе сваю тэрыторыю, абапіраючыся на войска і грамадзянскае насельніцтва. У сваю чаргу, поспех у гэтай абароне залежыць як ад адзінства ў войску, так и адзінства ўспрымання



Репозиторий БГАТУ

вайны грамадствам. У гэтым сэнсе войска и грамадства згуртаваліся ў жаданні і імкненні абараніць сваю тэрыторыю і перамагчы ворага. Яркім сведчаннем такой мэтавай усталёўкі і духоўнага парыву войска былі гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці, байцоў 86 пагранатрада, абаронцаў Магілёва і шматлікіх іншых вайсковых частак. Войска, складзенае з дзясяткаў этнасаў і канфесій, якое панесла цяжкія страты ў камандным складзе ў выніку рэпрэсій 1930-х гг., не мелая баявога досведу вядзення вайны ва ўмовах механізаваных армейскіх груповак, арыентаванае на фальшывы палітычны пастулат вядзення вайны на тэрыторыі агрэсара, неслая ў пачатковы перыяд вайны вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы па прычыне сур'ёзных пралікаў у вызначэнні баявой падрыхтоўкі войскаў, тэрмінаў пачатку нямецкай агрэсіі і кірункаў галоунага ўдару ворага, недаацэнкі яго сіл і пераацэньванні сваіх магчымасцяў [2, с. 10 – 11], было адзінае і патрыятычнае. І, нягледзячы на няўдачы першых тыдняў і месяцаў вайны, пачуццё ўпэўненасці ў войска, веры ў яго не пакідала кожнага змагара тагачаснай краіны. Войска было адзінае і моцнае духам, бо ўяуляла сабою народнае войска.

Меншае адзінства ў ацэнках вайны назіралася ў грамадстве. Некаторая частка насельніцтва з вайной злучала надзеі на вяртанне ў часы Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. ці гады калектывізацыі і індустрыялізацыі краіны страчанага матэрыяльнага багацця. Частка грамадства песціла надзею на палітычнае ўваскрашанне сябе як ідэолагаў і палітыкаў. Таму гэта частка насельніцтва актыўна супрацоўнічала з ворагам і бачыла сябе апорай беларускага народа, змагаром за яго волю. Але можа і сапрауды гэтыя людзі рупіліся за краіну і народ? Бо у свой час яны самі, а праз дзесяцігоддзі некаторыя з іх ідэйных паслядоунікаў, лічылі і лічаць, што ў тых умовах любая дзейнасць, накіраваная на спрыянне выжыванню нацыі, была патрыятычнай сама па сабе, бо давала надзею не толькі на выжыванне, але і стварэнне суверэннай дзяржавы. Аднак такое разуменне барацьбы за волю і незалежнасць ёсць праява скажонага разумення не толькі паняцця патрыятызму, але і святога для любога патрыёта краіны паняцця «Радзіма». Нічога няма жахлівей за прызнанне добраахвотнага васалітэту з надзеяй, што ў будучыні яго можна скінуць сілай зброі ці перакананнем сеньёра ў несправядлівасці сістэмы васальнай залежнасці ў выглядзе рабства. Гэты драматычны па сваёй сутнасці для асобы, а у шырокім



Репозиторий БГАТУ

кантэксце – для любога суб'екта, не ахвотніка быць здраднікам, але ідучага на кампраміс з сумленнем і абавязкам, выдатна паказаны сусветна вядомым беларускім пісьменнікам В. Быкавым у аповесці “Сотнікаў”: здзяйснілы забойства назаўжды застаецца забойцам, калабарацыянізм заўсёды ёсць здрада [10, с. 351 – 510]. Таму гэтыя людзі насамрэч выступалі ў ролі Юды: той здрадзіў і прадаў Хрыста, а гэтыя здраджвалі і жадалі прадаць народ. Цэлы народ! І таму гэтыя здраднікі і забойцы уласнага народа пад хлуслівымі лозунгамі, пад рознымі падставамі аб'яулялі сябе прадстаўнікамі нацыі, ствараючы пранямецкія нацыяналістычныя арганізацыі – “Беларуская народная самапомач” (22.10.1941), вайсковая арганізацыя для барацьбы з партызанамі і падпольшчыкамі “Беларускі корпус самаахoвы (29.06.1942), “Саюз беларускай моладзі” (22.06.1943), “Беларуская рада даверу“ (06.1943), “Беларуская цэнтральная рада” (21.12.1943), “Беларуская краёвая абарона”(сакавік 1944 г.). Як эпілог калабарацыйнай дзейнасці можна разглядаць так званы другі Усебеларускі кангрэс, які быў праведзены 27 чэрвеня 1944 г. у Мінску і абвешчаны здраднікамі паўнапраўным і найвышэйшым прадстаўніцтвам беларускага народа [8, с. 30 – 31; 6, с. 92, 93].

Іншая частка насельнщтва, – як правіла, гэта былі маргінальныя элементы, – разглядала вайну і як магчымасць выгодна для сябе асабіста вырашыць нейкія бягучыя пытанні за кошт іншых. Для абсалютнай жа большасці насельніцтва паняцці “Радзіма”, “Айчына”, “Воля” засталіся паняццямі значнымі. Для гэтай абсалютнай большасці вайна апынулася найцяжкай ношай. Па-першае, яна ашаламіла сваей нечаканасцю і хуткасцю прасоўвання агрэсара ў глыб краіны. Звыклае разглядаць усё з ідэалагічных пазіцый сталінскай уладнай машыны, насельніцтва ў першыя дні і тыдні было у шокавым стане, не даючы адказу на элементарнае пытанне: чаму войска, якое было “усіх мацней”, адыходзіць, кідаючы на волю лёсу мірнае насельніцтва, і што рабіць тым, хто застаецца? Па-другое, вайна прынесла ў кожную хату жах – за сябе, за родных і блізкіх, бо усё разумелі: любая вайна, як той малох, патрабуе ахвяр. І шмат ахвяр! Вайна разам з жахам прынесла і няўпэўненасць не толькі ў сённяшнім, але і ў заўтрашнім дні. Па-трэцяе, першыя дні вайны паказалі простаму чалавеку, нават вельмі далёкаму ад палітыкі, што прышэльцы жадаюць забраць не толькі іх жыцці, але нават іх душы!



Репозиторий БГАТУ

Ужо з першых дзён вайны агрэсар усталяваў татальны тэрор на ўсёй акупаванай тэрыторыі, паказаўшы сябе як ката, якіх свет не бачыў. Аблавы, пагромы, растрэлы закладнікаў, стварэнне яўрэйскіх гета, канцэнтрацыйных лагераў смерці, масавае забойства грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных сталі звычайнай справай для акупацыйных войскаў. Так, на тэрыторыі Беларусі за час акупацыі гітлераўцамі было знішчана каля 3 млн. чал., каля 400 тыс. вывезена на катаржныя працы у Германію [9, с. 27]. Стала практыкай масавае знішчэнне вёсак і гарадоў Беларусі. У прыватнасці, на яе тэрыторыі за гады вайны было знішчана і спалена 209 гарадоў і райцэнтраў, 9200 вёсак, разбурана 10465 прадпрыемстваў, больш 6000 км чыгуначнага палатна, 10000 калгасаў, 316 МТС, знишчана 420996 хат, практычна ўсе электрастанцыі; разрабаваны больш 90% станочнага і тэхнічнага абсталявання, 5425 музеяў, тэатрау і г.д. [3, с. 431 – 434]. За гады вайны на тэрыторыі Беларусі разам з жыхарамі было знішчана, спалена 628 вёсак, з іх 186 не адрадзілася. Часткова з насельніцтвам было спалена 4667 населеных пунктаў [4, с. 166].

Вельмі распаўсюджанай формай забойства мірных жыхароў было іх выкарыстанне ў якасці цяглавай сілы для транспартавання барон па мінным полі для размініравання [4, с. 163]. З вясны 1942 г. захопнікі сталі вывозіць на працу ў Германію працаздольнае насельнітва, галоўным чынам моладзь. Убачыўшы і зразумеўшы, што чакае народ пад пятой супастата, абсалютная большасць паднялася на святую вайну з ворагам. Гэта барацьба прыняла масавы характар і выявілася ў самых розных формах: з першых гадзін вайны – у масавым уступе ў атрады народнага апалчэння; у партызанскім супраціве, барацьбе падпольшчыкаў. Напрыклад, у тыле ворага на тэрыторыі, якая ахапіла да канца 1942 г. каля 30 %, а да 1944 г. 60 % рэспублікі, былі створаны і вялі актыўную ўзброеную барацьбу 213 партызанскіх брыгад, 258 асобных партызанскіх атрадаў з агульнай колькасцю больш 370 тысяч чалавек. У гарадах і мястэчках дзейнічалі больш 70 тыс. падпольшчыкау [6, с. 59; 3, с. 429; 4, с. 272; 5, с. 37].

Вайна адначасова стала індыкатарам трываласці адзінства асобы і дзяржавы, бо не ў апошнюю чаргу агрэсар рабіў стаўку на разбурэнне савецкай дзяржавы і лёгкую перамогу ў вайне ў сілу як яе шматнацыянальнасці, так і палітычнай сістэмы, якая раскалола грамадства ў 1917 г. і супраць мільёнаў праводзіла рэпрэсіі. Аднак



Репозиторий БГАТУ

парадокс складаецца ў тым, што вайна 1941 – 1945 гг. аб'яднала народ, аб'яднала яшчэ ўчора непрымірымых ворагаў – раскулачаных і калгаснікаў, рэпрэсаваных і іх праследавацеляў, уладу і царкву. І, тым не менш, людзі, рэпрэсаваныя ўладаю, дзеці гэтых людзей не трымалі злосці на краіну, а добраахвотнікамі ўступалі ў шэрагі апалчэння, прасіліся на фронт, дапамагалі краіне сваей гераічнай працай у тыле. Абсалютная іх большасць паднялася над сваімі крыўдамі, паставіўшы лёс краіны вышэй лесу сваей асабістай! У гэтым яднанні ёсць штосьці звышнатуральнае, незямное. Бо сапрауды цяжка паверыць у тое, што абсалютная большасць насельнщтва тагачаснай краіны вайну супраць дзяржавы, якая яго перасследвала, успрыняла скрозь прызму вайны народнай, а значыць вайны свяшчэннай. І гэта вынік не толькі ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва, што мела месца. Для мільёнаў і мільёнаў камунізм сапраўды быў лёсавызначальнай ідэяй, дзеля якой яны маглі ахвяраваць (і ахвяравалі!) жыццём. І іх былі легіёны! Але побач з імі былі тыя, якія не прынялі камуністычны ідэал, але гатовыя былі ахвяраваць сабою дзеля камуністычнай дзяржавы, якой для іх стала камуністычная краіна, камуністычная Айчына. Нам уяўляецца, прыняцця гэтай дзяржавы сваей дзяржавай гэтай часткай насельніцтва адбылося на аснове атаяснення двух блізкіх, але не тоесных па сэнсе паняццяў: дзяржава і Айчына! Для іх яны былі абсалютна тоеснымі, а таму яны абаранялі Айчыну, прабачыўшы ёй усе свае крыўды і несправядлівасці з яе боку ў адносінах да іх. Гэта па-першае. Па-другое, тоеснасць адбывалася і на аснове ўсведамлення ідентычнасті, то есць прыналежнасці кожнага да адной этнасацыяльнай групы, якая называецца савецкім народам. Па-трэцяе, да іх прыйшло разуменне таго факту, што разам з паражэннем у гэтай вайне будзе ліквідавана, знішчана не толька гэта дзяржава, гэта палітычная сістэма, але адбудзецца іх заняволенне, будзе усталявана сістэма рабства, з якога шляху да волі ні асабістай, ні палітычнай ужо не будзе. І ў гэтым інстынктыўным разуменні пагрозы ўласнаму быццю і быццю этнасу, дзяржава з'яўлялася адзінай апорай, абараняць якую было святым абавязкам! У адзінстве з большасцю насельніцтва, якое прыняла дадзеную палітычную сістэму па ідэалагічных меркаваннях на аснове праўдзівай веры ў светлае будучае, гэта і стварыла прэцэдэнт абсалютнага яднання народа дзеля спынення



Репозиторий БГАТУ

агрэсіі і разгрому ненавіснага ворага. У гэтым кантэксце пацвярджаецца праўда пра тое, што нельга перамагчы тую дзяржаву, у якой грамадства адзінае, а індывід у гадзіны нягоды для дзяржавы сваё асабістае падпарадкоўвае агульнаму.

З кожным годам усё далей зыходзяць у мінулае жахлівыя падзеі той вайны, з кожным годам усё менш становіцца яе ўдзельнікаў і сведак. Але вечным застаецца подзвіг беларускага народа, усіх народаў былой краіны ў той вайне, якія выратавалі народы ад знішчэння і заняволення. Вечная, незгасальная слава ваярам, партызанам, падпольшчыкам! Як і вечная пра іх памяць! Так было, так ёсць і так будзе ў стагоддзях!

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ


1. Нюрнбергский эпилог: уроки истории: материалы Международной научной конференции, Москва, 20 – 21 ноября 2006 г. / составитель Ю.М. Коршунов; под ред. Н.С. Лебедевой, В.В. Ищенко. – М.: ИВИ РАН, 2007. – 266 с.
2. Великая Отечественная война, 1941 – 1945. События. Люди. Документы: Краткий ист. Справочник / Под общ. ред. О.А. Ржешевского; сост. Е.К. Жигунов. – М.: Политиздат, 1990. – 464 с.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. – Мн.: БелЭн., 1994. – 537 с.
4. Коваленя, А.А. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А.А. Коваленя (руководитель автор. коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко и др. – Мн.: БЕЛТА, 2005. – 544 с.
5. Долготович, Б.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах / Б.Д. Долготович. – Мн.: Полымя, 1994. – 141 с.
6. Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие / А.А. Коваленя [и др.]; под ред. А.А. Ковалени, К.С. Сташкевича. – Мн.: Изд. Центр БГУ, 2005. – 271 с.
7. Тимахович, И.В. Битва за Белоруссию / И.В. Тимахович. – Мн.: Беларусь, 1994. – 254 с.
8. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл. (Рэдкал.: І.П. Шамякин (гал. рэд.) і інш.). – Мн.: БелСЭ, 1990. – С. 29-32.




Репозиторий БГАТУ

9. Пашкоў, Г. П. Памяць Беларусі: Рэспубліканская кніга / Рэд. кал.: Г.Л. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 2005. – 592 с.
10. Быкаў, В. Поўны збор твораў. У 14 т. Т. 3. Аповесці / В. Быкаў. – Мн.: Саюз беларускіх пісьменнікаў. – М.: ТАА "Выдавецтва «Время», 2005. – 656 с.

УДК 172.15

О. А. Бобровская, Т. Н. Ващаева

# ОРИЕНТИРУЕМСЯ НА ГРАЖДАНСТВЕННОСТЬ И ПАТРИОТИЗМ

В макете образовательного стандарта высшего образования первой ступени в требованиях к организации идеологической и воспитательной работы определено, что выпускник «должен обладать гражданской зрелостью, правовой и политической культурой, уважать закон и бережно относиться к социальным ценностям правового государства, чести и достоинству гражданина» [1].

Компетенции гражданственности и патриотизма занимают особую роль в социально-профессиональном становлении личности выпускника аграрно-технического университета, во многом определяя процесс его успешного вхождения в профессиональное сообщество.

Проблема гражданственности была и остается актуальной вне зависимости от пространственно-временных ареалов. Идея социальной значимости гражданских качеств остается одной из основополагающих при функционировании любого общества и государства [2].

Какой смысл мы вкладываем в понятие гражданственность? В процессе толкования этого понятия возникает немало трудностей. Они обусловлены исключительной сложностью явления и неопределенностью категории.

«Гражданственность – интегративное качество личности, основными элементами которой является нравственная, правовая и политическая культура. Патриотизм – чувство любви к своему отечеству и готовность защищать его интересы» [3; 4].

Одним из главных качеств, вершиной проявления гражданственности мы можем назвать внутреннюю готовность молодых



Репозиторий БГАТУ